# АСАБЛІВАСЦІ АЙКАНІМІІ КАЛІНКАВІЦКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

***Сугак К.В.*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, г. Мазыр)*
***Навуковы кіраўнік*** *– В.В. Шур, д-р філал. навук, прафесар*

Айконімы Калінкавіцкага раёна не маюць даўняй традыцыі вывучэння. Работа ў гэтай галіне пачалася ў апошнія дзесяцігоддзі і адзначылася выхадам у друк шэрагу тапанімічных даследаванняў. Асобныя айконімы гэтага раёна пераважна растлумачаны ў працах І. Гарыста “На беразе мора Герадота. Вандроўкі па Калінкавіцкай зямлі” (2014 г.), В. Лемцюговай “Тапонімы распавядаюць” (2008 г.), У. Лякіна “Калинковичи на перекрёстке дорог и эпох” (2010 г.), А. Рогалева “Назвы Бацькаўшчыны” (2011 г.), а таксама часткова разглядаюцца ў працах В. Жучкевіча, В. Шура і інш.

Калінкавіцкі раён уключае горад абласнога падпарадкавання Калінкавічы, гарадскі пасёлак Азарычы, 130 сельскіх населеных пунктаў.

Паводле лексіка-семантычнай класіфікацыі тапаасноў у айканіміі раёна вылучаюцца простыя айконімы *(Азарычы, Бабровічы, Антонаўка, Града)* – найбольш прадуктыўная група (86,2%), састаўныя айконімы *(Вялікія Аўцюкі, Малыя Аўцюкі, Чырвоная Слабодка, Чыстая Лужа)* – значна меншая група (9,2 %) і складаныя айконімы *(Стараселле, Навасёлкі)* – самая нешматлікая група (4,6%).

Аналіз складаных і састаўных айконімаў раёна дае магчымасць вызначыць характарыстыку асноў некаторых тапонімаў. Вылучаюць групу айконімаў, якая ўключае ў склад атрыбутыўных кампанентаў прыметнікі *новы*, *стары*, што на першай стадыі ўтварэння ўказвалі на час узнікнення айконімаў: *Стараселле, Навасёлкі, Новая Антонаўка* (27,8%). Наступная група – айконімы, якія фіксуюць у сваім складзе словы са значэннем колеру (зялёны, красны, чырвоны, чорны): *Чырвоная Слабодка,*



МГПУ им. И.П.Шамякина

*Чорнаўшчына, Зеляночы, Красная Ніва* (22,2%). Састаўныя назвы, іх асновы характарызуюць памер паселішчаў. Для выражэння такой прыметы выкарыстаны прыметнікі *вялікі*, *малы: Вялікія Аўцюкі, Малыя Аўцюкі, Вялікія Ліцвінавічы, Малыя Ліцвінавічы* (22,2%). Прадуктыўным з'яўляецца спосаб утварэння састаўных айконімаў, азначальнымі кампанентамі ў якіх ужываюцца прыметнікі, утвораныя ад назваў бліжэйшых вёсак. Яны ўдакладняюць субстантыўныя кампаненты, што ў тапаніміі гэтага рэгіёна даволі распаўсюджаныя (тыпу Буда, Рудня, Слабада і інш. у розных варыяцыях): *Антонаўская Рудня, Гарбавіцкая Рудня, Чырвоная Слабодка* (33,3%).

**Літаратура**

1. Жучкевич, В.А. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В.А. Жучкевич. – Минск : Изд. БГУ, 1974. – 448 с.

2. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Калінкавіцкага раёна / рэд.-укл. В.Р. Феранц. – Мінск : Ураджай, 1999. – 798 с.



МГПУ им. И.П. Шамякина